**Шаломенцаў Аляксей Аляксандравіч – удзельнік Вялікай Айчыннай вайны і вызвалення горада Дуброўна.**



Нарадзіўся ў 1923 г. у Чыцінскай вобласці. Да вайны працаваў у Забайкаллі.

Прайшоў школу малодшых камандзіраў і сяржантаў. У 1942 г. пайшоў на фронт, трапіў на Калінінскі фронт пад Ржэў. Быў паранены, лячыўся ў Омску. Потым зноў на вайну, у 97 гвардзейскі полк 31-ай стралковай дывізіі пад Маскву.

У 1944-м дывізія змагалася на беларускай зямлі, пасля баёў пад Віцебскам заслужыла славу “дывізіі прарыву”, “ударнай”. Удзельнічала ў прарыве варожай абароны на дубровенска-аршанскім напрамку. Прарывалася дывізія ў напрамку на востраў Юр’еў (Асінторф) уздоўж аўтамагістралі Масква – Мінск.

Полк Аляксея Аляксандравіча наступаў на правым фланзе паласы прарыву дывізіі, на пасёлак № 7. Не гледзячы на яраснае супраціўленне ворага, байцы прабіліся да в. Падліпкі і перарэзалі фашыстам дарогу Віцебск – Орша.

За ўдзел у аперацыі “Баграціён” узнагароджаны ордэнам Славы.

Скончыў вайну ў Кёнігсбергу ў званні ад’ютанта камандзіра палка.

Дэмабілізаваўся ў 1947 г.

Разам з братам вырашыў застацца на Дубровеншчыне, працаваў у калгасе на розных пасадах, апошняя – інжынер па тэхніцы бяспекі калгаса “Прагрэс”.

**Іван Канстанцінавіч Ізмадэнаў – удзельнік вызвалення горада Дуброўна.**



Нарадзіўся ў 1917 г. у Свярдлоўскай вобласці.

Да вайны скончыў Харкаўскае ваенна-палітычнае вучылішча. З 1939 г. у Чырвонай Арміі. У 1943 г. скончыў курсы "Выстрал".

У гады Вялікай Айчыннай вайны капітан, камандзір батальёна 612 стралковага палка 144 стралковай дывізіі. Асабіста вызначыўся ў баях за вызваленне Беларусі і Літвы. Так, толькі ў баях 1-3 студзеня 1943 г. за вёску Чырвоная Слабада яго батальён адбіў 12 контратак праціўніка.

У пасляваенныя гады (1950-1954 гг.) быў ваенным камендантам гг. Патсдама і Брандэрбурга (Германія). Затым узначальваў Нова-Пакроўскі райваенкамат Краснадарскага краю.

Узнагароджаны 6-цю ордэнамі.

Ганаровы грамадзянін горада Дуброўна з 1993 г.

Памёр у 1996 г.



ДОНЕСЕНИЕ

от командира 3 батальона
командиру 612 стрелкового полка

В течение 2 декабря батальон отбивал контратаки пехоты и танков противника.

При взятии дер. Красная Слобода батальон захватил 2 пушки 75 мм с боеприпасами и вездеход. Взято военное имущество: винтовки, автоматы, телефон.

Истреблено немцев: до 150 чел.

Наши потери: убито – 30 чел.
ранено – 24 чел.

Всего: 54 чел.

Комбат 3 Измоденов

ЦАМО СССР 612 сп, оп. 29059 с, д.3, л.66





ЧЕСТЬ И СЛАВА ГЕРОЯМ!

*Командиру подразделения — капитану ИЗМОДЕНОВУ*

За умелое руководство боевыми операциями, за стойкость и мужество, проявленные при отражении многочисленных контратак противника—ОБ'ЯВЛЯЮ БЛАГОДАРНОСТЬ ВАМ И ВСЕМУ ЛИЧНОМУ СОСТАВУ руководимого Вами подразделения.

КОМАНДИР ЧАСТИ.

*Снайперу рядовому ГАВРИЛОВУ*

ОБ'ЯВЛЯЮ БЛАГОДАРНОСТЬ Вам, товарищ Гаврилов, за правильное и умелое использование вверенного Вам Родиной оружия, в результате чего только за один день Вы уничтожили 10 гитлеровцев.

И впредь так же беспощадно истребляйте немецких захватчиков!

КОМАНДИР ЧАСТИ.

*Старшему сержанту ДЕМИДОВУ*

За мужество и стойкость, проявленную при отражении вражеских контратак, в результате чего вы подбили немецкий танк,—ОБ'ЯВЛЯЮ ВАМ БЛАГОДАРНОСТЬ.

КОМАНДИР ЧАСТИ.

*Старшему лейтенанту ПРУДНИКОВУ, командирам орудий ВОРОНИНУ и РАЗЖИГАЕВУ*

За умелое и стойкое поведение в бою, в ходе которого Вы уничтожили 2 немецких танка и 1 „фердинанд"—ОБ'ЯВЛЯЮ ВАМ БЛАГОДАРНОСТЬ. Желаю дальнейших боевых успехов.

КОМАНДИР ЧАСТИ.

**Валерый Іванавіч Лаппо – генеральны дырэктар Віцебскага праектна-рамонтна-будаўнічага ўнітарнага прадпрыемства "Витебскоблдорстрой".**



Нарадзіўся ў 1949 годзе ў вёсцы Вялікія Нягновічы Барысаўскага раёна. У 1972 годзе скончыў Беларускі палітэхнічны інстытут па спецыяльнасці "Аўтамабільныя дарогі". З 1972 па 1975 гг. працаваў майстрам, прарабам, старэйшым прарабам дарожнага будаўнічага раёна № 4 галоўнага ўпраўлення шасэйных дарог пры СМ БССР.

З 1975 года – галоўны інжынер дарожнага будаўнічага раёна № 26 горада Шаркаўшчына Віцебскай вобласці. Потым працаваў начальнікам дарожнага будаўнічага раёна горада Оршы Віцебскай вобласці, кіраўніком дарожна-будаўнічага трэста № 3 г. Магілёў.

З 1989 года з'яўляецца генеральным дырэктарам Віцебскага праектна-рамонтна-будаўнічага ўнітарнага прадпрыемства "Витебскоблдорстрой". Аказваў значную дапамогу Дубровенскаму раёну.

Ганаровы грамадзянін горада Дуброўна з мая 1998 года. Жыве і працуе ў горадзе Віцебск.



**Віцебскае праектна-рамонтна-будаўнічае ўнітарнае прадпрыемства "Витебскоблдорстрой"**

**Аляксей Ануфрыевіч Дудараў - беларускі драматург.**

Нарадзіўся ў вёсцы Кляны, Дубровенскага раёна, у сям'і калгаснікаў.

Скончыў Наваполацкае прафесійна-тэхнічнае вучылішча нафтавікоў, працаваў слесарам на нафтаперапрацоўчым заводзе. Служыў у Савецкай Арміі. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут па спецыяльнасці «акцёр драмы і кіно». Працаваў акцёрам, загадчыкам літаратурнай часткі ТЮГа, членам сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі «Тэлефільм». З'яўляўся сябрам Саюза Пісьменнікаў СССР. З'яўляецца сакратаром Саюза тэатральных дзеячаў Беларусі. Член Беларускага ПЭН-цэнтра. У 1991—2002 гг. займаў пасаду галоўнага рэдактара часопіса «Мастацтва». З 2003 па 2013 г. з'яўляўся мастацкім кіраўніком Драматычнага тэатра Беларускай арміі.

Дэбютаваў у друку ў 1973 г. Пісаў апавяданні, казкі для дзяцей. Вядомы як драматург і кінадраматург. Выдаў зборнікі апавяданняў «Святая птушка». Па сцэнарыях А. Дударава пастаўлены кароткаметражныя і мастацкія фільмы («Суседзі», «Белыя росы», і інш.).

Аўтар п'ес «Выбар», «Парог», «Вечар», «Злом». П'есы «Апошні ўзлёт» і «Радавыя» прысвечаны падзеям Вялікай Айчыннай вайны, вельмі актыўна працуе ў жанры гістарычнай драмы: п'есы «Князь Вітаўт», «Ядвіга», «Чорная панна Нясвіжа», «Крыж» і інш.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і іншымі ўзнагародамі. Лаўрэат прэмій Ленінскага камсамола Беларусі за зборнік апавяданняў «Святая птушка» і п'есу «Выбар», Ленінскага камсамола за творы, Дзяржаўнай прэміі СССР за спектакль «Радавыя», прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва.

Ганаровы грамадзянін горада Дуброўна з 2003 г.








Спектакль "Чорная панная Нясвіжа"

**Мікалай Пятровіч Пашынскі – заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь. Аўтар ідэі фестываля “Дняпроўскія галасы ў Дуброўне”.**



Нарадзіўся ў 1950 г. у вёсцы Вялікая Дзяцель Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці.

У 1967 г. пасля заканчэння сярэдняй школы працаваў мастацкім кіраўніком Дабрыньскага сельскага дома культуры. У гэтым жа годзе паступіў у Магілёўскае культурна-асветніцкае вучылішча, якое скончыў у 1969 г. (харавое аддзяленне).

З 1969 па 1971 г. служыў у радах Савецкай арміі. З 1972 па 1986 г. працаваў у Віцебскім абласным Доме народнай творчасці (метадыстам, старшым метадыстам, намеснікам дырэктара). З 1986 па 1988 г. – намеснік начальніка ўпраўлення культуры аблвыканкама. З 1988 па 1990 г. – загадчык сектарам культуры Віцебскага абкома КПБ. З 1990 г. па 2011 г. – начальнік упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама.

Скончыў Ленінградскі інстытут культуры імя Н.К. Крупскай (1979 г.) па спецыяльнасці “рэжысёр масавых святаў і прадстаўленняў”, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1992 г.) па спецыяльнасці “палітолаг, выкладчык сацыяльна-палітычных дысцыплін”. З 1978 па 1985 г. быў галоўным рэжысёрам абласнога свята “Браслаўскія зарніцы”.

З 1994 г. быў аўтарам і рэжысёрам Рэгіянальнага фестываля песні і музыкі “Дняпроўскія галасы ў Дуброўне” з удзелам творчых калектываў і выканаўцаў Падняпроўя Расіі, Беларусі, Украіны.

Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь (2000 г.)

Ганаровы грамадзянін горада Дуброўна з 2003 г.



**Ганаровыя грамадзяне горада Дуброўна А.А. Дудараў і М.П. Пашынскі**

**Юрый Васільевіч Гаўрын – мастак, член Саюза мастакоў Беларусі.**



Нарадзіўся 17 студзеня 1943 г. Пасля вызвалення Беларусі пераехаў з маці з Самарканскай вобл. у г. Дуброўна. У 1966 г. скончыў Мінскае мастацкае вучылішча, у 1972 г. Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут.

З 1965 г. прымае ўдзел у мастацкіх выставах.

З 1978 г. – член Саюза мастакоў Беларусі.

Працуе ў галіне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва і станковага жывапісу.

Аўтар мноства вітражоў у грамадска важных будынках Беларусі: у тэатры імя Я.Коласа ў Віцебску (1988 г.), у кінатэатры "Цэнтральны" у Мінску (1990 г.), у будынку Прамбудбанка і Нацбанка ў Гомелі (1989 г.), у Міністэрстве абароны ў Расіі, у Маскве (1993 г.), размалёўку з рэльефам "Медыцына" у Мінскім медыцынскім ўніверсітэце (1966 г.)



Жывапісныя творы вылучаюцца арыгінальнасцю сюжэтаў, кампазіцыйнай завершанасцю, лірычнасцю. Карціны "Аўтапартрэт" (1976), "Дыялог" (1989), серыя карцін "Белы бераг" (1995-1996) і інш. Знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску, літаратурным музеі М. Багдановіча, іншых музеях нашай краіны і за мяжой. Зараз жыве ў Мінску.

У 2013 г. адбылася персанальная выстава карцін у рамках XX фестываля песні і музыкі "Дняпроўскія галасы ў Дуброўне".

Ганаровы грамадзянін горада Дуброўна з 2003 г.



Юрый Гаўрын "Вечар". Палатно.
80x100. 2006. Беларусь